**Інга Воюш**

# Вайна ў дзіцячым сэрцы:
# проза В.Быкава на ўроку напісання сачынення

Сучасны настаўнік роднай літаратуры не толькі вучыць разумець і любіць слоўнае мастацтва, але, на жаль, адначасова змагаецца з такімі праблемамі, як уплыў рускамоўнага асяроддзя, стаўленне да беларускай літаратуры, як да другаснай (у адносінах да рускай, англійскай), часта нават вымушаны даказваць, што ягоны прадмет патрэбны дзецям не менш за іншыя. У такіх умовах надзвычай важна прапанаваць для чытання такія творы, якія самім сваім існаваннем пераканалі б вучняў у тым, што вялікая літаратура можа ствараццa на беларускай мове, на нацыянальнай глебе, на мясцовым матэрыяле. Неацэнную каштоўнасць у гэтым плане маюць творы В.Быкава. Многія з выпускнікоў прызнаюцца, што адкрылі для сябе нашу літаратуру менавіта пазнаёміўшыся з творамі гэтага пісьменніка. Таму нам здаецца вельмі істотным пытанне, як вывучаецца спадчына гэтага мастака ў школе.

Асаблівую ўвагу хацелася б надаць напісанню сачынення па творчасці В.Быкава, бо менавіта такая форма работы дазваляе пранікнуць і ў глыбіні пісьменнікавай філасофіі, і ў прастору дзіцячай душы, яна падсвядома прымушае вучня зазірнуць у свой унутраны свет, знайсці ў ім месца для быкаўскага слова.

Пры вывучэнні аповесці В.Быкава “Жураўліны крык” у 7 класе якраз прадугледжана напісанне пісьмовай творчай работы. Давайце прасочым, як іменна праходзіць работа над сачыненнем па гэтым тэксце.

Дзеці знаёмяцца з пісьмовымі формамі работ у пачатковай школе. Нягледзячы на гэта, этап навучання самастойнаму пісьмоваму выказванню нельга выпускаць з поля зроку і ў сярэдніх, і ў старэйшых класах, бо з кожным годам мастацкі матэрыял ускладняецца, адпаведна, ад апісання вучні паступова пераходзяць да параўнальнай характарыстыкі і разважання, нарэшце, кожны раз ад іх патрабуецца новы ўзровень мыслення і выкладання думкі.

Як навучыць самастойна думаць, крытычна мысліць, абгрунтоўваць сваю пазіцыю, ды яшчэ занатоўваць гэта ў сшытку? Як вядома, для дзяцей існуе пэўная цяжкасць пры пераходзе з вуснай мовы на пісьмовую. Часта гэта праяўляецца ў тым, што гладка напісанаму сачыненню бракуе самастойнасці, доказнасці, змястоўнасці, альбо наадварот – жывая, творчая работа поўная дробных памылак.

Мэта нашай публікацыі – на матэрыяле згаданай аповесці В.Быкава паказаць некалькі практычных прыёмаў, якія б дапамаглі вучню структураваць работу, граматна аформіць думку, выкласці сваё меркаванне, вобразна кажучы, даць яму ў рукі інструмент, узор, прыклад, як пісьмова занатоўваць уласныя пачуцці, адкрыцці, арыентавацца ў іх і пераносіць на паперу.

Каб не пераказваць знаёмы настаўнікам парадак работы над сачыненнем, да кожнага з этапаў зробім толькі пэўныя каментарыі.

**ПАДРЫХТОЎЧЫ ЭТАП**. Найперш перад вывучэннем твора дзецям аб’яўляецца, што па ім трэба будзе пісаць сачыненне, называюцца магчымыя тэмы. Тады ў працэсе чытання і аналізу тэксту ў вучняў з’яўляецца стымул назапашваць матэрыял: цытаты, удалыя выразы па абранай тэме, уласныя заўвагі, цікавыя ідэі. Формы збірання можна прапанаваць розныя:

1) на этапе чытання твора:

- занатоўваць найбольш цікавыя, выразныя, харктарыстычныя цытаты на асобных картках з указаннем старонкі (іх лягчэй потым сартаваць і можна не перапісваць у чарнавік, пазначыўшы ў ім толькі нумар карткі);
- рабіць закладкі на старонках з найбольш важнымі эпізодамі;
- весці чытацкі дзённік, пазначаць там імёны герояў, іх кароткія характарыстыкі, аўтарскія апісанні, партрэт і інш.
- запаўняць лісток з назваю “Мае думкі” – запісваць уласныя ідэі, назіранні і пытанні, якія ўзніклі пры знаёмстве з творам.

2) на этапе аналізу:

- рабіць выпіскі з крытычнх артыкулаў падручніка альбо інш. літаратуразнаўчых крыніц;
- весці канспект абмеркавання твора на ўроку.

Зразумела, вельмі важна падабраць для вучняў тэмы, якія б давалі магчымасць ім раскрыцца і пісьменна (граматна) выказацца. Пажадана, каб тэма адпавядала хаця б некаторым з наступных крытэрыяў:

- настаўнік павінен добра ўяўляць, што іменна ён сам напісаў бы па прапанаванай тэме і да якой высновы дзеці павінны прыйсці ў выніку;
- у ёй павіннна заключацца падказка, пра што пісаць,
- тэма павінна быць гранічна канкрэтная, каб не вымушаць дзіця, па-першае, закранаць усе тэмы і вобразы твора, па-другое, перавышаць патрабуемы аб’ём (1,5 – 2 старонкі);

- па магчымасці нязбітая, каб нельга было скарыстаць чыю-небудзь гатовую работу;

- можа быць выхад на сучаснасць, каб даць вучню магчымасць паразважаць, ужываючы ўласны вопыт, “прысвоіць” вывучаемы матэрыял;

- дастугшая для раскрыцця, каб ведаў, набытых у класе і з падручніка, хапіла для яе асэнсавання;

- каб патрабавала элементу творчасці, выяўлення ўласнай думкі вучня, а не ўзнаўлення канспекта;

Калі выбар фармулёвак вялікі, то мэтазгодна падаць такія з іх, якія патрабуюць асэнсавання тэксту на розным узроўні; да таго ж трэба ўлічыць, што павінны быць прыдатныя тэмы і для хлопчыкаў, і для дзяўчынак.

Прапануем тры варыянты тэм па аповесці пісьменніка:

1. *“Адзін на адзін са смерцю: лёс радавога Глечыка ў аповесці В.Быкава “Жураўліны крык””* У выніку павінен атрымацца тэкст з гістарычным развіццём падзей, заснаваным на прыёме “шляхам за аўтарам”, з элементамі апісання.

2. *“Выяўленне сапраўднай сутнасці чалавека на мяжы жыцця і смерці (па аповесці В.Быкава “Жураўліны крык”)”* Больш складаная форма, бо абапіраецца на параўнанне і паралельны разгляд некалькіх вобразаў, апеляцыю да аўтарскага погляду на праблему.

3. *“Што адабрала вайна ў байцоў з чыгуначнага пераезда?”* Самая складаная тэма, бо патрабуе самастойнага разважання, звароту да ўласнага маральнага вопыту, супастаўлення з сучаснасцю.

**УРОК НАПІСАННЯ САЧЫНЕННЯ.**

I. **Аргмомант**. Можна выкарыстаць музычную застаўку (відэаматэрыялы).

II. **Аб’яўленне тэмы, мэты ўрока**. Яшчэ раз агучваюцца тэмы сачыненняў. Мэта заняткаў – вучыцца пісаць сачыненне, дзяліцца сваімі думкамі, пісьмова афармляць іх.

Ведаючы, што вучням вызначыцца з тэмай няпроста, настаўнік можа параіць, як яе выбраць. Вопыт паказвае, што тэма, па якой адразу ўзніклі думкі (якая пры першым прачытанні “зачапіла”, спадабалася), як правіла, потым лепш паддаецца раскрыццю.

III. **Работа на тэмай**.

Выяўленне праблем, пастаўленых у тэмах. Ідэя будучага сачынення.

<u>Работа над планам</u>. Настаўнік нагадвае патрабаванні да пэўных частак работы, прапануе розныя варыянты іх разгортвання. Вучні выбіраюць той, які падыдзе для абранай імі тэмы.

1. Уступ.

*Патрабаванні да ўступу*. Неабходна адказаць на пытанні: пра які твор якога аўтара будзе ісці гаворка, якія галоўныя праблемы будуць вырашаны ў сачыненні.

*Варыянты ўступаў* (пасля слэша для зручнасці пазначаны нумары тэм, да якіх падыходзіць уступ):

- лірычны/1 *(У народзе вераць, што душы памерлых людзей ператвараюцца ў птушак. Менавіта гэтая прыкмета і стала асновай метафары ў назве аповесці В.Быкава...)*;
- жыццёвая гісторыя/1 *(У адным з інтэрв'ю Васіль Быкаў прызнаваўся, што пісаў Глечыка з сябе. Што ж яднае пісьменніка з яго ным героем?)*;
- цытата з мастацкага тэксту – вершаваная або празаічная/3 *(Вайна, па словах В.Быкава, – "самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі". Усёй сваёй творчасцю пісьменнік выносіць ёй прысуд. Гэтак адбываецца і ў аповесці...)*;
- зварот да аўтарытэтаў – вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячоў/2 *(Рускі пісьменнік В.Каверын вельмі высока ацэньваў творчасць В.Быкава: "У В.Быкава – рэдкі талент маляваць подзвіг як справу натуральную для вартага чалавека... Ён стваральнік характараў, і характары ў яго – адбітак часу. Ён піша пра вайну, але тым не менш яго творы глыбока сучасныя". Я лічу, што гэтыя словы можна поўнасцю аднесці да аповесці "Жураўліны крык", таму што...)*;
- народная мудрасць, афарызм, крылаты выраз/2 *(Нездарма ў народзе кажуць, што страх за няпраўдай ходзіць. Часцей за ўсё баязліўца можна пазнаць па ілжывасці, а героя – па праўдзівасці. Гэта праяўляецца і ў аповесці В.Быкава...)*;
- біблейская ісціна/3 *(Не першая, але адна з самых галоўных запаведзяў роду чалавечага: не забі. Гэтая простая ісціна на вайне (ды, бывае, і ў наш час) сціраецца з чалавечай памяці – і гэта прыносіць на зямлю гора, боль і слёзы. Менавіта аднаўленню нашай памяці пра Вялікую Айчынную прысвечана аповесць...)*;
- разважанне над эпіграфам/3 ***(Там гнёзды спалены, / Там птушаняты знішчаны, / Смяротны дым плыве над папялішчамі… П.Панчанка**. Яшчэ ў 1939 годзе паэт, душою прадчуваючы бяду для сваёй "жураўлінай радзімы", напісаў гэтыя радкі. А праз дваццаць з лішнім год з'явілася рэалістычная гісторыя пра няроўны бой быкаўскіх герояў за безыменны чыгуначны пераезд. На жаль, прадказанне збылося... Што прынесла вайна нашым героям? Што назаўжды адабрала ў іх?)*;
- яркі прыклад/1,3 *(Толькі трое з кожнай сотні равеснікаў В.Быкава засталіся ў жывых пасля мінулай вайны. Менавіта іх памяці прысвечаны твор...)*;
- праблемнае пытанне/2 *(Што адбываецца ў душы чалавека перад суровым тварам смерці? Адзін імкнецца любым коштам выратаваць уласнае жыццё... Другі...)*;

- слоўнікавы артыкул (не прыдатны для тэмы).

2. Асноўная частка.

*Патрабаванні да зместу*: акрамя праграмных, прад'яўляюцца патрабавані творчага характару – паказ уласнага разумення праблемы, пастаўленай у тэме, і магчымыя погляды на яе, сувязь з мастацкім тэкстам (цытаванне, апеляцыя да думак аўтара), карэктны зварот да літаратурнай крытыкі, дакладнае, неразмытае выражэнне думкі, разнастайнасць канструкцый, а таксама пажадана не падмяняць аналіз (чаму адбылося?) апісаннем (што і як адбылося?).

*Варыянты асноўнай часткі*:

- гістарычны/1 *(<u>Напачатку</u> Глечык – маладзенькі баец, "няўдака" ў ваеннай справе, <u>потым</u> у ім прачынаецца мужнасць і, <u>нарэшце</u>, ён за лічаныя гадзіны сталее і гераічна гіне)*. <u>Вывады</u> *(Аўтар увасобіў асабістую трагедыю маладога байца, але гэтым выявіў трагедыю ўсяго ваеннага пакалення)*.

- паралельны/2 (Што <u>агульнага</u> ў персанажаў? *(Усе яны жывыя людзі са сваім мінулым, якім прыйшлося нялёгка на вайне)*. Чым <u>адрозніваюцца</u> героі твора перад тварам смерці? *(У экстрэмальнай сітуацыі кожны выяўляецца па-свойму: Свіст імкнецца ўсім прыўзняць настрой, Глечык ваюе са сваім страхам і перамагае яго, Карпенка дбае, каб з найменшымі стратамі выканаць баявую задачу, годна прымае смерць Фішар; Аўсееў здраджвае ў апошнюю хвіліну, Пшанічны пячэцца пра ўласнае жыццё))*. <u>Вывады</u> *(Аўтар свядома выкарыстоўвае выпрабаванне боем, блізкай смерцю, каб выявіць унутраную сутнасць кожнага з герояў)*.

- лагічны/3 (<u>гіпотэза</u> *(Вайна адабрала ў людзей маладосць, будучыню, жыццё ў Фішара, Свіста, Глечыка, сумленне – у Аўсеева і Пшанічнага))*, <u>аргументы</u> *(прыклады, цытаты, думкі аўтара сачынення)*. <u>Вывады</u> *(Вайна нічым не можа быць апраўдана)*.

3. Заключэнне.

*Патрабаванні да заключэння*: наяўнасць агульнага выніку прапрацаванай працы па аналізе твора, адпаведнасць вынікаў тэме сачынення, значэнне твора (вобраза) для аўтара сачынення, для пісьменнікавай творчасці, беларускай літаратуры, сусветнай літаратуры (калі ёсць).

*Варыянты*:

- уласнае меркаванне/1,2,3 *(1.Я думаю (мне здаецца), што... 2.Разважаючы над тэмай, я прыйшла(-оў) да высновы, што... 3.Такім чынам, падводзячы вынік, можна сказаць… 4. Як адну з асаблівасцяў творчасці В.Быкава можна адзначыць…)*;

- апеляцыя ад аўтарытэта, пагаджэнне з ім ці не/1,2,3 *("...Чытач можа адысці ў свой, мірны час, да сваіх, спраў, клопатаў, радасцей... Але што ён не можа (і не здолее),*

*не павінен, не мае права – гэта забыць! Во гэтых франтавых хлапчукоў...” – так пісаў пра аповесць славуты пісьменнік, выдатны крытык Алесь Адамовіч. І я пагаджаюся з ім, бо...)*;

- асабістае ўражанне ад твора/1,2,3 *(1.Аповесць “Жураўліны крык” спадабалася (не спадабалася) мне, таму што... 2.Гэты герой блізкі мне сваім разуменнем жыцця, бо...)*;
- эстэтычны, маральны вопыт/1,2,3 *(1.Мне здаецца, што сваім творам аўтар хацеў сказаць нам, нашчадкам (будучым пакаленням), што... 2.Аповесць прымушае чытача задумацца над...)*;
- значэнне ў літаратурным працэсе/1,2,3 *(Творчасць В.Быкава мае істотнае значэнне для ўсяго літаратурнага працэсу XX стагоддзя, бо менавіта ён адным з першых напісаў суровую праўду пра мінулую вайну, пра чалавека ў ёй...).*

IV. **Работа над лексічным і граматычным аспектам**.

1. Лексіка.

Сінонімы слова *пісьменнік – аўтар, мастак слова, празаік, апавядальнік, знаўца чалавечых душ, літаратар, В.Быкаў, былы франтавік, творца.*

Сінонімы да слова *знаўца – крытык, аўтар падручніка, артыкула, даследчык, літаратуразнаўца, філолаг.*

Сінонімы да слова *твор – аповесць, тэкст, аповед, проза, балючая споведзь вайны, быкаўскае слова, гэтыя старонкі.*

2. Граматыка.

Скланенне прозвішча аўтара *(ідэя, думкі Васіля Быкава, удалося Васілю Быкаву, зразумець Васіля Быкава, пагадзіцца з Васілём Быкавым, успаміны аб Васілю Быкаву (лепш пра Васіля Быкава))*, назвы твора *(аўтар аповесці, “Жураўлінага крыку”; дзякуючы аповесці, “Жураўлінаму крыку”; чытаючы аповесць, “Жураўліны крык”; пазнаёміліся з аповесцю, “Жураўліным крыкам”; прачыталі ў аповесці, “Жураўліным крыку”).*

3. Сінтаксіс.

Афармленне эпіграфа (прозвішча аўтара без дужак):

*Гэта быў сорак першы палаючы год...*

*П.Панчанка*

Цытаванне прозы (Ц – цытата, а – словы аўтара):

“Ццц”, – ааа. *“Як ні жахліва і безнадзейна яму было заставацца ў адзіноце..., але, забіўшы Аўсеева, ён адчуў, што прыйдзецца трываць да канца. І хлопец няспешна і без былой баязлівасці... хадзіў па траншэі і ладзіў зброю”, – так апісвае В.Быкаў душэўны стан Глечыка перад апошнім боем.*

Ааа: “Ццц”. *В.Быкаў так апісвае душэўны стан Глечыка перад апошнім боем: “Як ні жахліва і безнадзейна яму было заставацца ў адзіноце..., але, забіўшы Аўсеева, ён адчуў, што прыйдзецца трываць да канца. І хлопец няспешна і без былой баязлівасці... хадзіў па траншэі і ладзіў зброю”.*

Ааа піша, што “ццц”. *В.Быкаў піша, як перад апошнім боем Глечык “адчуў, што прыйдзецца трываць да канца... і без былой баязлівасці... хадзіў па траншэі і ладзіў зброю”.*

Знакі прыпынку пры пабочных канструкцыях тыпу *як піша даследчык..., па словах аўтара, на маю думку* і інш.

V. Калектыўнае (або самастойнае) складанне прыкладнага плана для кожнай з тэм.

| “Адзін на адзін са смерцю: лёс радавога Глечыка ў аповесці В.Быкава “Жураўліны крык”” | “Выяўленне сапраўднай сутнасці чалавека на мяжы жыцця і смерці (па аповесці В.Быкава “Жураўліны крык”)” | “Што адабрала вайна ў байцоў з чыгуначнага пераезда?” |
|---|---|---|
| І. Уступ | І. Уступ | І. Уступ |
| ІІ. Асноўная частка | ІІ. Асноўная частка | ІІ. Асноўная частка |
| 1. “Няўдака” Глечык | 1. Не спасаваць перад тварам небяспекі | 1. Мірнае жыццё байцоў з пераезда |
| 2. Першая перамога | 2. Жыццё даражэй за ўсё | 2. Без надзеі на выратаванне |
| 3. Агонь па здрадніку | ІІІ. Заключэнне | ІІІ. Заключэнне |
| 4. Падбіты журавок | | |
| ІІІ. Заключэнне | | |

VI. **Напісанне чарнавікоў**. Звычайна гэты этап прапануецца для дамашняй работы, але мы лічым, што мэтазгодна выконваць яе ў класе. На нашу думку, пры напісанні чарнавіка побач павінен быць настаўнік, бо ясна выразіць думку і адначасова правільна яе аформіць не вельмі лёгка. Да таго ж дзеці лепш запамінаюць, як прымяняць пэўныя правілы па мове, непасрэдна выкарыстоўваючы іх у працэсе напісання сачынення.

VII. **Напісанне чыставіка**. Калі сачыненне не кантрольнае, то гэту працу можна задаць на дом. Перапіс работы ў чыставік дома дазваляе пазбегнуць некаторых праблем: спісваць работу з “крытыкі” ўжо не мае сэнсу, бо яна фактычна гатова; дзеці, чые бацькі не валодаюць беларускай мовай, будуць на роўных правах з тымі, каму дапамагаюць дома; з’явіцца магчымасць затраціць на афармленне работы ў чыставіку столькі часу, колькі запатрабуецца (а не ўподбег пасля званка); верагоднасць таго, што непадрыхтаванае дзіця напіша работу “з галавы” (як гэта бывае на ўроках, калі зададзены на дом чарнавік не напісаны), выключаецца.

**ПРАВЕРКА І АНАЛІЗ РАБОТ**.

**КАРЭКЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ, АНАЛІЗ ПАМЫЛАК**.

Зразумела, кожны настаўнік абірае ўласную стратэгію падрыхтоўкі і правядзення урокаў напісання сачыненняў, творча падыходзіць да гэтай працы, і таму нашы заўвагі не маюць катэгарычнага характару і не прэтэндуюць на вычарпальнасць. Магчыма, яны проста навядуць настаўніка-практыка на свежую думку, дададуць некалькі рысаў да назапашаных матэрыялаў па творчасці цудоўнага пісьменніка, рэдкага чалавека, вядомага грамадскага дзеяча, сына нашай зямлі – Васіля Уладзіміравіча Быкава. Можа, праз яго аповесць вучні бліжэй падыдуць да асэнсавання агульначалавечых каштоўнасцей і нацыянальнай душы.

Літаратура

Беларуская літаратура: Падруч. для 7 кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі. навучання / Аўт.-склад. М.А. Лазарук і інш. – Мн., 2001.

Карнеги Д. Как вырабатывать уверенность в себе, выступая публично. – Мн., 1990.

Львов М.Р. Риторика: Учеб. пос. для 10–11 кл. общеобр. шк. – М., 1996.